№ 16 (465)
Красавік 2013 года

Краязнаўчая газета

Выдаецца з красавіка 2003 года
www.bfk.by

У нумары:

☞ Школьнае краязнаўства: маладыя даследчыкі з Ілы – стар. 2

☞ Горыч: подых красавіцкай навальніцы – стар. 3

☞ Таямніцы: старадаўні касцёл маладзечанскі – стар. 5

Аб вывучэнні беларускай мовы ў Парыжы

Сёлета 12 красавіка ў Нацыянальным інстытуце моваў і цывілізацыяў г. Парыжа (Institut national des langues et civilisations orientales, INALCO) адбылася сустрэча Пасла Беларусі ў Францыі Паўла Латушкі з прэзідэнтам INALCO Мануэль Франк, кіраўніком аддзела па міжнародным супрацоўніцтве INALCO Мары-Сібіль дэ Віен, а таксама з кіраўніцтвам факультэта, дзе вывучаецца беларуская мова.

У ходзе размовы дасягнутая папярэдняя дамоўленасць аб супрацоўніцтве паміж INALCO і адной з вышэйшых навучальных установаў Беларусі.

Пасольствам Беларусі ў Францыі будзе сфармаваная і перададзеная бібліятэка беларускай класічнай і сучаснай літаратуры, выданняў па гісторыі і культуры нашай краіны для выкарыстання ў навучальным працэсе.

П. Латушка паінфармаваў прэзідэнта INALCO аб заснаванні Пасольствам Беларусі ў Францыі заахвочвання для лепшага студэнта, які вывучае беларускую мову. Пасольства накіруе за кошт беларускага боку лепшага студэнта ў азнаямляльную паездку ў Беларусь з мэтай наведвання беларускіх гістарычных мясцінаў і ўстановаў культуры.

Акрамя таго дасягнутая дамоўленасць аб правядзенні ў Інстытуце разнастайных мерапрыемстваў з мэтай папулярызацыі беларускай культуры і мовы ў студэнцкім асяроддзі, а таксама аб дэманстрацыі мастацкага фільма «У тумане» паводле аповесці народнага пісьменніка Беларусі Васіля Быкава.

INALCO з'яўляецца найбуйнейшай навучальнай установай Еўропы па вывучэнні замежных моваў. На сёняшні дзень тут вядзецца выкладанне 93-х моваў краінаў Усходняй і Цэнтральнай Еўропы, Азіі, Акеаніі, Афрыкі і народаў Амерыкі.

Паводле інфармацыі Пасольства Беларусі ў Францыі

На тым тыдні...

✓**9 красавіка** ў мінскай бібліятэцы № 15 імя Цёткі пачала працу **фотавыстаўка Міколы Лінніка «Вартаўнікі спрадвечнае зямлі»**, прымеркаваная да Міжнароднага дня помнікаў і гістарычных мясцінаў. Аўтару хацелася паказаць розныя помнікі беларускай зямлі, як мы іх шануем, як імкнемся захаваць для нашчадкаў тое, што засталося ў спадчыну. У экспазіцыі прадстаўленыя здымкі як шырока вядомых помнікаў і мясцінаў, так і мала вядомых.

Выстаўка працуе да 6 мая

✓**16 красавіка** ў Музеі сучаснага выяўленчага мастацтва адбылося **адкрыццё выстаўкі графікі Лукаша Левандоўскага** (Польшча). Тут прадстаўленыя графічныя працы, якія адлюстроўваюць творчыя пошукі і тэхнічныя эксперыменты мастака за апошні час. І ў большасці іх аўтар працягвае візуальнае даследаванне сваёй радзімы – ваколіцаў мястэчка Букавец. Таксама мастак знаёміць са сваімі працамі, прысвечанымі юбілею паўстання 1863 г.

✓**17 красавіка** ў Дзяржаўным літаратурным музеі Янкі Купалы запрацавала **выстаўка «Усё для сваёй бацькаўшчыны – Беларусі»**, прысвечаная 100-годдзю трэцяга паэтычнага зборніка Янкі Купалы «Шляхам жыцця». Надрукаваны ў 1913 годзе ў Санкт-Пецярбургу зборнік атрымаў высокую ацэнку як цэласная з'ява, сур'ёзны здабытак беларускай літаратуры. На выстаўцы экспануюцца асобнікі першага выдання з дарчымі аўтографамі, а таксама перавыданні 1923 і 1935 гадоў, тамы прыжыццёвых збораў твораў паэта, у якіх зборнік друкаваўся цалкам.

✓**17 красавіка** ў Нацыянальным гістарычным музеі Рэспублікі Беларусь адкрылі дэкаратыўна-ўжытковую выстаўку **«Фарбы душы»**. *Падрабязней пра яе на стар. 4.*

✓**17 красавіка** ў Дзяржаўным літаратурна-мемарыяльным музеі Якуба Коласа **прэзентавалі кнігу «У віры падзей»** беларускага паэта і мастака-жывапісца **Сяргея Давідовіча**.

Ганаровымі гасцямі мерапрыемства былі народная артыстка Беларусі Марыя Захарэвіч, старшыня Мінскага аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі Міхась Пазнякоў, літаратары Казімір Камейша, Алесь Марціновіч, Павел Саковіч і інш. Сапраўднай украсай вечара сталі песні пад гітару ў выкананні Сяргея Давідовіча.

✓У Міжнародны дзень помнікаў і гістарычных мясцінаў **18 красавіка** ў Магілёўскім абласным краязнаўчым музеі **адбылася прэзентацыя мультымедыйнага дыска з вынікамі працы Архітэктурнай секцыі Беларускага добраахвотнага таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры** – даследчымі праектамі і архітэктурнымі праектнымі прапановамі.

Сярод праектаў, прадстаўленых на дыску, – працы, прысвечаныя Магілёву, архітэктурнай спадчыне яго гістарычнага цэнтра. З выданнем знаёміў старшыня Рэспубліканскага савета ГА БДТАПГіК Антон Астаповіч. Мерапрыемства прайшло ў рамках агульнанацыянальнай кампаніі «Будзьма беларусамі!»

✓**18 красавіка** ў Нацыянальным гістарычным музеі Рэспублікі Беларусь адкрылі выстаўку ўнікальных гістарычніх помнікаў Вялікага Княства Літоўскага **«Скарбы шляхецкіх архіваў»**. На ёй прадстаўленыя арыгінальныя помнікі картаграфіі, сфрагістыкі, графікі і жывапісу, дакументы XV–XIX стст. са збору калекцыянера Ігара Сурмачэўскага. Сярод рарытэтаў – карта Вялікага Княства Літоўскага Т. Макоўскага 1631 г., каралеўскія граматы і прывілеі, дзяржаўныя дакументы XVI–XVIII стст. і іншыя помнікі. *Падрабязней глядзіце на стар. 6.*

Выстаўку можна наведаць да 12 мая.

✓**З 18 па 21 красавіка** ў рамках Міжнароднага дня помнікаў і гістарычных мясцінаў у гарадах і вёсках краіны адбыўся **Фэст экскурсаводаў**.

Падрабязней пра мерапрыемства чытайце на стар. 2.

Фэст экскурсаводаў 2013 адбыўся!

Надвор'е ў выхадныя 20 і 21 красавіка было, дзякуй Богу, добрае, і ўсе экскурсіі прайшлі па плане.

У гэтым годзе арганізатарам ужо не трэба было шукаць экскурсаводаў, яны самі тэлефанавалі і прапаноўвалі свае маршруты. У некаторых абласных гарадах знайшліся ініцыятары, якія ўзялі на сябе падрыхтоўку і каардынацыю экскурсіяў і нават міні-фэстаў у сваіх мясцовасцях. Да нас далучылася ініцыятыўная група праекта «Дотык да Мінска» з прапановай сумеснай распрацоўкі экскурсіяў для людзей з абмежаванымі магчымасцямі, веласіпедысты з Брэста прапанавалі правесці ў рамках акцыі велапрабег з экскурсіяй па фартах Брэсцкай крэпасці. Сёлета Фэст падтрымаў і Дэпартамент па турызме Міністэрства спорту і турызму Рэспублікі Беларусь. Дзякуем за падтрымку!

У Мінску за два дні прайшлі 57 экскурсіяў. Былі традыцыйныя маршруты (Плошча Незалежнасці, Дубрава Чапскага, Мінск Татарскі), былі зусім новыя цікавыя тэмы: упершыню праведзеная экскурсія па мясцінах Станіслава Манюшкі з завяршальным міні-канцэртам ад гурта «Doux Souvenir», па адрасах мінскіх фотамайстэрняў XIX – пачатку XX ст., па архітэктуры мінскага «сталінскага ампіру», па Кастрычніцкай плошчы і шмат іншых.

Таксама ў Мінску прайшлі ажно тры экскурсіі, спецыяльна распрацаваныя для дзяцей: па бібліятэцы імя Астроўскага, па Траецкім прадмесці і Лошыцкім парку. У парку анімацыя экскурсіі была рэалізаваная дзякуючы народнаму літаратурнаму тэатру «Жывое слова» (БДПУ імя Максіма Танка).

Экскурсія ў мінскім Свята-Духавым кафедральным саборы

П. Іваніцкі і А. Завадскі расказваюць пра страчаныя святыні Мінска

Веласіпедысты таксама не адставалі. Акрамя брэсцкай экскурсіі ў аматараў веласіпедаў была магчымасць праехаць па Вяснянцы і па мясцінах Караля Чапскага, а таксама пазнаёміцца з цікавосткамі Заслаўя (гэтая экскурсія ладзілася турыстычным прадпрыемствам «Greenteam»).

У рамках Фэсту дзякуючы ініцыятыве «Дотык да Мінска» ўпершыню была праведзеная экскурсія для людзей з праблемамі зроку, а таксама інтэграваная экскурсія для людзей з праблемамі апорна-рухальнага апарату.

Некалькі экскурсіяў, якія праходзілі ў мінскіх мікрараёнах, былі прарэкламаваныя пры дапамозе мясцовых ЖЭСаў папяровымі абвесткамі, таму на іх прыйшло досыць шмат жыхароў. Агульная колькасць людзей, якія наведалі экскурсіі ў Мінску за два дні, – каля 1 800 чалавек. Гэта вялікая колькасць нават для 57-і маршрутаў, але экскурсаводы моцна стараліся, каб усе іх добра пачулі.

Традыцыйна добра паставіліся да правядзення экскурсіяў і настаяцелі мінскіх храмаў, большасць з якіх расчыніла свае дзверы для цікаўных мінчанаў.

З рэгіянальных гарадоў найбольш актыўна праявіла сябе Гродна, дзе прайшлі 12 экскурсіяў. Цікавая таксама атрымалася праграма ў Полацку, Віцебску, Гомелі, Слуцку. Асабліва хацелася б адзначыць Брэст, які так актыўна падключыўся ўпершыню і дзе прайшло 5 экскурсіяў, сярод якіх велапрабег на 250 чалавек! Таксама прайшлі экскурсіі яшчэ ў двух дзясятках гарадоў і мястэчак Беларусі. Агулам экскурсіі ў рэгіёнах наведалі каля 650-і зацікаўленых асобаў.

Аргкамітэт выказвае падзяку ўсім экскурсаводам за іх удзел у Фэсце, валанцёрам, якія вельмі дапамаглі ў арганізацыі і правядзенні экскурсіяў, турыстычным прадпрыемствамі «Greemteam», «Тандэм Тур», «Мерцана», творчым калектывам «Doux Souvenir», тэатру «Жывое слова», Аляксандру Галкоўскаму і Веры Паклонскай за ўпрыгожванне і тэатральнае напаўненне некаторых экскурсіяў.

Асобная вялікая падзяка кампаніі «Каляровы кот» – за раздрукоўку паштовак.

Дзякуй усім арганізатарам і экскурсаводам у рэгіёнах.

Дзякуй вялікі ўсім! Мы спадзяемся, што сёлетнія экскурсіі дапамаглі жыхарам беларускіх гарадоў і мястэчак крыху бліжэй пазнаёміцца з будынкамі, плошчамі, ландшафтамі, храмамі, праспектамі, палацамі і сядзібамі, побач з якімі яны жывуць.

Аргкамітэт Фэсту экскурсаводаў:

ГА «Беларускі камітэт ІКАМОС»;

ГА «Беларуская асацыяцыя экскурсаводаў і гідаў-перакладчыкаў»;

ГА «Беларускі фонд культуры»;

Краязнаўчы клуб «Дыярыуш» (БДПУ імя Максіма Танка);

МГА «Гісторыка»;

Інтэрнэт-партал holiday.by;

Ініцыятыва «Дотык да Мінска»

Вывучаем родны край

Традыцыйна ў нашай школе ў сакавіку праходзіць месячнік па краязнаўстве. Яно і зразумела – у школе вядзецца вялікая праца па вывучэнні гісторыі роднага краю. Тут дзейнічаюць два народныя музеі (краязнаўчы і літаратурны), створаны інфармацыйны краязнаўча-метадычны цэнтр, куды часта наведваюцца вучні, каб дазнацца штосьці новае і цікавае пра родны куток. Працуе школьны прэс-цэнтр. Настаўнікі, вучні, іх бацькі і іншыя зацікаўленыя людзі з задавальненнем прымаюць удзел у зборы музейных прадметаў, наладжванні экскурсіяў, даследаваннях па гісторыі радзімы.

А тут – месячнік па краязнаўстве! Гэта азначае, што цягам месяца вучні ўсіх класаў займаліся цікавымі справамі. Усе пабывалі на экскурсіях у школьных народных музеях, наведалі паталагаанатамічны музей і музей «Спадчына» Ільянскага дзяржаўнага аграрнага каледжа. Там мы падзівіліся з цікавых экспанатаў, даведаліся пра гісторыю каледжа і яго выпускнікоў.

Нягледзячы на неспрыяльнае надвор'е дзеці з пачатковых класаў прынялі ўдзел у экскурсіях па нашай вёсцы. Яны даведаліся, якія назвы і чаму носяць вуліцы Ільі. Вучні 5–8 класаў, прымаючы ўдзел у экскурсіях па вёсцы, наведалі брацкую магілу воінаў, загінулых пры вызваленні Ільі. Таксама пабывалі на магіле А. Грымаця, чыё імя носіць нашая школа. Старэйшыя, навучэнцы 9–11 класаў, знаёміліся з прамысловымі прадпрыемствамі Ільі. Асабліва запомнілася наведванне ММЦ – філіяла Мінскага мэблевага цэнтра, які займаецца пераапрацоўкай драўніны.

На класных гадзінах праходзілі гутаркі па гісторыі родных мясцінаў, пра сучасны стан былога Ільянскага раёна, пра знакамітых людзей, што сваёю нястомнаю працай праслаўляюць край.

Акрамя таго кіраўнікі школьных музеяў Р. Шэрая, Т. Анішкевіч і краязнавец У. Кажамяка падрыхтавалі і правялі ў класах віктарыны «Вывучаем родны край».

У рэсурсным цэнтры прайшлі экскурсіі па фотавыстаўцы «Мясціны роднага краю ў 1920–1930-я гады», прадстаўленай таварыствам аховы помнікаў. Кіраўнік цэнтра В. Ерашонак змястоўна расказала пра эпізоды, адлюстраваныя на фотаздымках. Асабліва цікава было пазнаёміцца з дваром пана Багдановіча ў Абадоўцах, панскім маёнткам у Мацькаўцах, урачыстым адкрыццём помніка паўстанцам 1863 года ў мястэчку Ільля і інш.

Кожны клас аформіў краязнаўчы альбом па выніках эстафеты краязнаўчых справаў, дзе змешчаныя матэрыялы пра ўдзел класа ў месячніку. Цяпер падводзяцца вынікі месячніка, ідзе вылучэнне лепшых краязнаўцаў сярод настаўнікаў, навучэнцаў, класаў.

Сняжана ЦЕРАХАВА,
вучаніца 9 «А» класа
Ільянскай СШ імя А.А. Грымаця

На фота:
нашыя музеі – наш гонар

Наш даўні пастаянны падпісчык і аўтар Іван Панасюк з Лунінца напрыканцы мінулага года выдаў чарговую кнігу. Новае выданне прысвечанае тамтэйшай навучальнай установе, якая існавала ў райцэнтры цягам трыццаці гадоў. Па вайне яна была створаная для дзяцей, якія з розных прычынаў засталіся без бацькоў ці з некім адным. Пазней сюды траплялі з шматдзетных сем'яў, з сем'яў інвалідаў Вялікай Айчыннай вайны. А напрыканцы існавання ўстановы сюды траплялі хлопчыкі і дзяўчынкі з сем'яў, што жылі на далёкіх хутарах, а таксама з нядобрых сем'яў, пераводзілі цэлымі класамі з дзіцячых дамоў Кобрына, Пінска, Мінска...

Пачынаецца кніга са своеасаблівага гімна школы, далей ідзе спіс дырэктараў, а таксама настаўнікаў, выхавацеляў, усяго абслугоўнага персаналу (куды ўвайшлі і нянечкі, і лабаранты, кухары, электрыкі, і качагары ды кіроўцы...). Асноўны змест зборніка складаюць газетныя публікацыі розных гадоў, прысвечаныя інтэрнату, і ўспаміны былых настаўнікаў і выхаванцаў установы, са сценаў якой выйшла нямала годных грамадзянаў краіны. Сярод выхаванцаў школы-інтэрната – выпускнік 1970-га Вячаслаў Воўчык, дырэктар Моўчадскай школы-інтэрната Баранавіцкага раёна Лілія Падвіцельская (Селівончык), эканаміст Сяргей Занько, Мікалай Канановіч, Ала Кананенка (Новікава) ды іншыя. З розных прычынаў трапілі яны і сотні іншых дзяцей у Лунінецкую школу-інтэрнат, па-рознаму склаліся іх лёсы. Але ўзгадваюць яны сваё інтэрнацкае дзяцінства з удзячнасцю за навуку. І не ў апошнюю чаргу – дзякуючы выдатным педагогам, старэйшым памочнікам яны выйшлі на шырокі жыццёвы прастор. Завяршае кнігу вялікі блок фотаздымкаў. Частка з вялікага архіва, адзначае аўтар-укладальнік, што захоўваецца ў Івана Аляксеевіча.

Выйшла кніга невялікім накладам, таму, зазначае І. Панасюк, прасцей знайсці выданне ва ўнітарным прадпрыемстве «Моя перспектыва» або праз аўтара, які жыве ў Лунінцы. Ёсць яна і ў інтэрнэце. А цяпер Іван Аляксеевіч заняты напісаннем аўтабіяграфічнай трылогіі. Спадзяемся, і там будзе шмат цікавага не толькі для блізкіх краязнаўцы, але і для ягоных землякоў. Дарэчы, 25 красавіка ў рупліўцы дзень нараджэння, з якім віншуе і «Краязнаўчая газета». Добрага здароўя, Іван Аляксеевіч, няхай нягоды не скараюць, а мацуюць!

Дванаццатая кніга настаўніка і краязнаўцы

У лунінецкім Цэнтры дзіцячай творчасці сабраліся тыя, чый лёс так ці інакш быў звязаны з інтэрнатам – навучальнай установай, што існавала на Лунінеччыне з 1963 па 1991 гады. Падставай паслужыў выхад у свет новай кнігі краязнаўцы Івана Панасюка «Интернат ты наш, интернатушка...».

Старшыня райкама прафсаюза работнікаў адукацыі Нэлі Рафаловіч, дзякуючы садзеянню якой ажыццяўлялася фінансавая падтрымка, расказала, наколькі важнай стала праца Івана Аляксеевіча для захавання памяці і гістарычнай спадчыны Лунінеччыны. Шчырыя словы ўдзячнасці выказаў начальнік аддзела адукацыі Іван Раковіч, які ўручыў аўтару памятны адрас.

З 2007-га І. Панасюк на заслужаным адпачынку, але паранейшаму яго крэда застаецца нязменным: «Выхоўваць маладое пакаленне сумленнымі, добразычлівымі грамадзянамі Рэспублікі Беларусь, каб любілі родную беларускую мову, гісторыю і прыроду палескага краю, паважалі дасягненні папярэдніх пакаленняў, зберагалі створанае працалюбнымі і беражлівымі продкамі, каб памяталі старажытныя беларускія традыцыі і абрады».

– Цудоўна, што Іван Аляксеевіч, які шмат гадоў працаваў выкладчыкам нямецкай мовы, знайшоў сябе ў такой важнай справе, як краязнаўства і стварэнне кніг. Гэтая – ужо дванаццатая, – зазначыла старшыня савета ветэранаў аддзела адукацыі Наталля Казанкова. – У зале знаходзяцца як героі новай кнігі, так і тыя, чые ўспаміны ўвайшлі ў выданне. Гэта людзі, якія ўсяе душой служылі высакароднай справе – настаўнічалі і выхоўвалі дзяцей.

І. Панасюк запрасіў гасцей паглыбіцца ў гісторыю. На экране адна за другой мільгалі старонкі жыцця інтэрната. Чорнабелыя здымкі выпускнікоў і настаўнікаў сведчылі пра тое, як даўно гэта было. А красамоўныя каментары, што чуліся з месцаў, сцвярджалі адваротнае – успаміны яшчэ зусім «свежыя»:

– Сустракаем Новы год...

– А нашы ЮІДэшнікі заўсёды былі на вышыні.

– Ой, а гэта – конкурс «Мальчыш-Кібальчыш» у воінскай часці...

– А гэта – ранішняя гімнастыка ў Сасновым бары, што праводзілася перад пачаткам заняткаў...

– Гляньце, рыхтуем бочкі для засолкі агуркоў...

Нават па невялікіх рэпліках можна меркаваць, наколькі цікавае і разнастайнае жыццё кіпела ў інтэрнаце, які закончылі 1 200 выпускнікоў. Усяго тут выкладалі 50 настаўнікаў (сярод іх Кацярына Пракапчук, матэматык з 41-гадовым педагагічным стажам).

– Шаснаццаць гадоў я адпрацавала ў інтэрнаце, – распавяла К. Пракапчук. – У 1970-х мы ўсе былі маладыя, энтузіязму шмат, і працавалася вельмі лёгка. А якія нашыя дзеці былі прыгожыя на ўрачыстых мерапрыемствах: усе дзяўчынкі ў белых фартушках, з кветкамі, вырашчанымі ўласнымі рукамі. Удосталь было сродкаў на набыццё прызоў для правядзення пазашкольных мерапрыемстваў. Ды й матэрыяльная база заўсёды абнаўлялася...

Шчырыя словы ўдзячнасці аўтару за магчымасць дакрануцца да былога, прыгадаць маладосць і калегаў, многіх з якіх ужо няма, выказалі настаўнікі пачатковых класаў Валянціна Вярэніч і працоўнага навучання Канстанцін Куст.

Не засталіся ўбаку і былыя выхаванцы. Выпускніца 1976 года Алена Кудач (Лукашэвіч) цяпер працуе ў Мікашэвіцкім леспрамгасе:

– Гэтая кніга аб'ядноўвае ўсіх нас: і хто вучыўся тут, і хто працаваў. Я ўдзячная аўтару за радасць прыемных успамінаў, за магчымасць сказаць «дзякуй» усім настаўнікам, у тым ліку – Ніне Рахацэвіч і Кацярыне Пракапчук, якія заўсёды падтрымлівалі, нават калі інтэрнат застаўся ў мінулым.

Выпускнік 1988 года Сяргей Занько, цяпер эканаміст аддзела статыстыкі, зазначыў:

– Здаецца, калі б не кніга Івана Аляксеевіча, памяць пра інтэрнат з гадамі перастала б існаваць. А так, можна не сумнявацца, пра яго не раз яшчэ прыгадаюць добрым словам, як гэта раблю я.

Ад шчырага сэрца І. Панасюк выказаў удзячнасць усім, хто прыйшоў на сустрэчу, хто падзяліўся ўспамінамі пра час вучобы і працы ва ўстанове. І ўручыў кнігі.

Добрым падарункам для ўсіх гасцей стаў невялікі канцэрт выхаванцаў ЦДТ – вакалістаў Ліяны Яраховіч і Жэні Бугаковай, а таксама танцавальнага дуэта – Вераніка Пуцака і Уладзіслаў Чыжык.

Алена ШАНДАРЭЎСКАЯ,
г. Лунінец

26 красавіка 1986 г. на Чарнобыльскай АЭС узарваўся адзін з рэактараў. Чорная хмара закрыла сонца над Беларуссю

Подых красавіцкай навальніцы

Чарнобыльская катастрофа закранула жыццё не адной сям'і. Шмат каму давялося пачуць яе цяжкія крокі, шмат чые лёсы змяніла яна незваротна. Сярод іх, адна з многіх – і Надзея Хвядосаўна Уласенка. Вёску Старыя Хракавічы ў Нараўлянскім раёне, дзе жыла сям'я Уласенкаў, не трапіла ў зону адчужэння, але і бокам яе трагедыя не абыйшла.

Вось што расказала Надзея Хвядосаўна пра тыя красавіцкія дні 1986 года:

– Я тады вазіла абеды па палях. Прыехалі мы з шафёрам на поле, і раптам я бачу – такі чорны дым валіць, што страх. Адзін з мужыкоў сказаў, што гэта колы паляць, другі – што заправачная станцыя гарыць. А ўжо як стала вядома, што здарылася, прыслалі туды людзей – цэлую вайсковую часць прыслалі, і міліцыі шмат. Самазваламі вазілі камяні, пясок, шыфер і закідвалі ў рэактар. Ваду лілі, зямлю сыпалі – і не давалі рады. Глушылі той рэактар, глушылі – заглушаць, зробіцца ціха. А пасля зноў як ірване, і усё, што засыпалі, ляціць угору – шыфер, каменне...

Людзей з вёсак вывозілі. Заскочаць у хату, загадаюць усё пакідаць, маўляў, усё вам на новым месцы будзе. Хапалі людзей і садзілі ў машыны. Добра, калі паспеў ухапіць што ў вузел звязаць, а не – дык кідалі нажытае. А там жа былі і мука, і крупы – цэлымі мяхамі. Я ў той дзень пайшла на гарод, ажно бачу – едзе машына за машынай, усе поўныя людзей. І людзі галосяць-галосяць...

Кажучы гэта, Надзея Хвядосаўна выцірае слёзы. Напэўна, самым страшным з таго, што ўбачыла яна пасля аварыі, было якраз гэтае відовішча – людзі, якіх раптоўна сілком адарвалі ад сваёй зямлі.

Высяленцаў развозілі па навакольных вёсках.

– Да нас прывезлі іх столькі, – кажа жанчына, – што, паверце, нельга было прайсці. Дык людзям жа не на двары начаваць, бралі іх да сябе. І ў нашай хаце жыла сям'я, муж з жонкай, а пасля яшчэ сын іх прыехаў. Хлопец толькі з арміі вярнуўся, прыехаў дадому – а вёска пустая. Вось і ездзіў па наваколлі, шукаў бацькоў.

Тыя вёскі, што знаходзіліся недалёка ад зоны адчужэння, прымусова не высялялі, але людзі ўсё-такі раз'язджаліся. Дзеці забіралі бацькоў, а хто і сам з'язджаў. Надзея Хвядосаўна ў 2005 годзе пераехала ў Баранавічы, а яе муж, Рыгор Аляксеевіч, застаўся ў вёсцы – казаў, што пакуль яшчэ варушыцца, то пажыве сам.

– Ён шкадаваў сваё кідаць. У нас хата была дабрэнная, – расказвае жанчына, – тады толькі пабудавалі яе, красавацца адно, любавацца. Выган побач, салаўі спяваюць. У гародзе – крыніца, мы там копанку зрабілі.

Колькі гадоў яны з мужам жылі паасобку, столькі Надзея Хвядосаўна і ўгаворвала яго пераехаць у горад. Летась Рыгор Аляксеевіч, нарэшце, згадзіўся, сказаў, што дачакаецца вясны і пераедзе. А праз тры дні яго не стала.

Расказала Надзея Хвядосаўна і пра тое, як неўзабаве пасля катастрофы на ЧАЭС у іх вёску прыехалі амерыканцы. «Першым часам вы нічога не бойцеся, – казалі яны, – піце па сто грамаў, і нічога вам не будзе. Радыяцыя скажацца праз дваццаць пяць гадоў». Зрэшты, сказалася яна і раней. «А з таго часу нашыя мужыкі як узяліся за сто грамаў, так і п'юць, – дадае жанчына. – Маўляў, усё роўна ж паміраць».

Ды і людзей у Старых Хракавічах засталося няшмат – добра, калі дзясяткі два «сваіх» набярэцца. Затое многа чужых – тых, хто прыехаў у вёску пасля катастрофы на ЧАЭС. Прыезджыя занімаюць пустыя хаты, і ніхто іх не чапае. Працуюць у асноўным на ферме ў Старых Хракавічах, бывае, што і п'юць, а часам абкрадаюць мясцовых жыхароў – здараецца, нават курэй павыцягваюць з хлява. «Калі б нашыя людзі там жылі, і я б засталася», – кажа жанчына. Цяпер і заставацца ўжо няма дзе. Пасля смерці мужа хату прадалі, у вёску былыя жыхары з'язджаюцца толькі на Радаўніцу. Сёлета Надзея Хвядосаўна з дзецьмі таксама збіралася на радзіму. «Вось і пабачымся», – дадае жанчына, і цяжка зразумець, пра каго яна кажа: пра былых аднавяскоўцаў, пра памерлага мужа ці пра сваю вёску.

Ніна КАЗЛЕНЯ
Фота з альбома Н.Х. Уласенкі

Могілкі ў Старых Хракавічах. У цэнтры Н.К. Уласенка з роднымі і аднавяскоўцамі

Экспазіцыя вытанчанасці і густу

17 красавіка ў Нацыянальным гістарычным музеі Рэспублікі Беларусь пачала працу міжнародная выстаўка дэкаратыўна-ўжытковага мастацтва «Фарбы душы». Натхняльнікам, стваральнікам і куратарам гэтага праекта ўжо на працягу некалькіх гадоў з'яўляецца Марына Духан, якая з намеснікам дырэктара музея Нінай Калымага вітала гасцей і распачала адкрыццё.

Міжнародная выстаўка ўжо шосты раз праходзіць у сценах гасцінага музея. Сёлета ў ёй прыняла ўдзел рэкордная колькасць майстроў – 80 удзельнікаў з 8 краінаў. Менавіта з-за такой вялікай лічбы арганізатары не сталі прадстаўляць усіх удзельнікаў асобна, а раілі падыходзіць да іх, знаёміцца, цікавіцца творчасцю, а можа і абменьвацца вопытам. Акрамя ўжо традыцыйна прадстаўленых раней накірункаў (бісер, батык, лямец, скура, пластылін, тэкстыльны і нітачны дызайн, скрапбукінг, лэмпварк, метал) у экспазіцыі прадстаўленыя працы, выкананыя ў тэхніцы роспісу па дрэве, маскі ў тэхніцы «пап'е-машэ» і іншыя разгалінаванні графічнага дызайну.

Не даваў засумаваць гасцям і ўдзельнікам адкрыцця гурт «Капэля» пад кіраўніцтвам Алеся Лася. Пад акампанемент музыкі былі прадстаўленыя дызайнерскія мадэлі вопраткі на імправізаваным паказе мод, што на пэўны час ператварыў выставачную залу ў сапраўдны подыум. Куратарам і вядучай паказу была Галіна Мяшкова – кандыдат мастацтвазнаўства, дацэнт кафедры дызайну і тэкстылю Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў. Таксама былі прадстаўленыя мадэлі, што адлюстроўвалі ўяўленне беларусаў пра традыцыйныя касцюмы народаў свету ў сучаснай інтэрпрэтацыі.

Майстар-клас па танцах праводзяць А. Лось і гурт «Капэля»

Завяршылася імпрэза майстар-класам па народных танцах ад шаноўных музыкаў.

Напрыканцы ж хочацца дадаць, што ў межах выстаўкі адбудзецца шэраг конкурсаў: «Путешествие по стилям: от античности до хай-тека», «Браслет – привлекательное платье для запястья», конкурс сімпатыяў гледачоў. Атрымаць асалоду ад наведвання экспазіцыі можна да 5 мая.

Наста КАДЫРЫБ
Фота аўтара

Праца як падстава для росшукаў

Знаёмства з даследаваннем кандыдата філалагічных навук Міколы Труса «Янка Купала ў Славакіі» пачынаецца з грунтоўнага ўступнага слова доктара філасофіі, кандыдата навук, Надзвычайнага і Паўнамоцнага Пасла Славацкай Рэспублікі ў Рэспубліцы Беларусь Мар'яна Сэрваткі. І вось што ён, у прыватнасці, заўважыў: *«Нягледзячы на тое, што ў сучаснасці вельмі цяжка прапанаваць нешта новае з біяграфіі літаратурных класікаў, кніга "Янка Купала ў Славакіі" можа даць новыя кірункі ў даследаванні творчасці беларускага волата. Размова ідзе пра новыя факты культурнага супрацоўніцтва, якія пацверджаны дакументальнымі матэрыяламі. Таму выданне публікацыі з'яўляецца беспрэцэдэнтнай падзеяй у гісторыі беларускай літаратурнай навукі. Манаграфія вызначае шырокія магчымасці працы ў славацкіх і беларускіх архівах і бібліятэках і перспектыву адкрыцця новых цікавых фактаў з гісторыі нашых узаемаадносін»*.

М. Трус фундаментальна распрацаваў тэму, якая і надалей магла б знаходзіцца на перыферыі літаратуразнаўства, на ўзбочыне купалазнаўства. Энцыклапедычны даведнік «Янка Купала», які і сёння ўяўляе велізарную каштоўнасць, спрыяе наступным крокам у вывучэнні жыцця і творчасці народнага песняра, накіроўвае да тэмы знаходжання паэта ў Браціславе, Славакіі. Але ж распрацоўка была надзвычай павярхоўнай, абмяжоўвалася канстатацыяй факта. *«У асвятленні візіту Янкі Купалы ў Чэхаславакію ў складзе дэлегацыі савецкіх журналістаў і пісьменнікаў*, – піша М. Трус, – *уласна чэшскі складнік у купалазнаўчай літаратуры мае свае набыткі. Хоць вычарпанай гэтую тэму палічыць ніяк нельга. Абставіны ж цэлага тыдня знаходжання дэлегацыі ў Славакіі савецкі друк практычна праігнараваў. Можам меркаваць, што на тое былі палітычныя прычыны. Ды і сам пясняр у справаздачных артыкулах пра славацкія дні і ўражанні фактычна нічога не напісаў. Магчыма, гэта засталося ў планах, магчыма, была перапіска з некаторымі славацкімі калегамі, але клопаты юбілейнага, вядомыя пакручастыя зрухі гісторыі ў наступныя гады ламалі планы. Што наракаць, тады ламаліся не толькі планы, але і жыцці. Думаецца, славацкія ўражанні сталі аднымі з самых светлых імгнення-ўспамінаў пісьменніка. Але гэта ў сферы тонкага, асабістага. Для даследчыкаў жа выяўляецца неапрацаваная дзялянка»*.

М. Трус пераадолеў магчымыя сумненні сваіх папярэднікаў у купалазнаўстве. Відаць, хтосьці раней і задаваўся пытаннем прысутнасці Янкі Купалы ў Славакіі, але ж адвагу, даследчыцкія старанні стрымліваў. Усяго ж некалькі дзён Купала гасцяваў у Славакіі – 15–18 кастрычніка 1935 года. Нават *«...славацкія калегі,* – піша М. Трус, – *засцерагалі мяне перад марнасцю пошукавых клопатаў, маўляў, усё, што тычыцца славацка-савецкіх сувязей у сацыялістычныя часы, сабрана і апублікавана». Але літаратуразнаўца праявіў разважлівасць і настойлівасць. Спярша – у развагах пра тое, што ніколі не трэба ўспрымаць тэму як «вычарпаную»*. Ды і нельга было не ўлічваць ранейшыя засцярогі: на прадмет, што дазвалялася цэнзурай друкаваць, а што не магло прайсці ў друк з-за ідэалагічных меркаванняў. А яшчэ настойлівасці і пошуку драбніцаў фактаграфічнага матэрыялу спрыяла і разуменне пераацэнак з пункту гледжання часовага. Калі надзеі з'яўляюцца вельмі блізкімі, то не заўсёды адразу асэнсоўваеш іх значнасць.

Праца М. Труса «Янка Купала ў Славакіі» нагадала мне яшчэ адзін прыклад. У сярэдзіне 1980-х пабачыла свет кніга пісьменніка-дакументаліста Міколы Калінковіча «Палескія дні Аляксандра Блока». Рускі паэт у Першую сусветную вайну служыў на беларускім Палессі ў ваенна-будаўнічым атрадзе. Нічога, праўда, не пісаў, толькі лісты са сваіх ваенных палескіх адрасоў. М. Калінковіч, пачынаючы даследчыцкую працу, чуў і такое: «Лепей, малады чалавек, напішыце на тэму "Блок і космас"...». Але беларускі літаратар праявіў настойлівасць, сабраў усе магчымыя сведчанні жыцця рускага паэта ў Беларусі, паказаў праявы эмацыйных стасункаў таго часу з творчасцю Блока ў наступныя гады.

Славацкія дні ў лёсе Янкі Купалы, відаць, былі няпростыя. У 2007 годзе слынны беларускі літаратуразнаўца Іван Чарота працытаваў згадкі пра падзеі кастрычніка 1935-га Вольгі Кухтавай (Шандаравай-малодшай), дачкі пісьменніка Э. Шандара, які сустракаўся з Купалам. Партрэт беларускага песняра выглядае наступным чынам: «Гэта быў мужчына знешне элегантны і ў манерах з відавочнай інтэлігентнасцю, далікатнасцю... выгляд у яго спакойны, але нейкі сумны. Пры сустрэчы, размове паводзіў сябе асцярожна...».

Задумаўшы рэалізаваць навукова-творчы праект «Янка Купала ў Славакіі», М. Трус надрукаваў у часопісе «Роднае слова» дзесяць артыкулаў на гэтую тэму. Артыкулы ствараліся з улікам агульнага плана даследавання, сабраныя разам уяўляюць цэласнасць і паслядоўную карціну знаходжання народнага песняра ў Славакіі, адлюстроўваюць яго стасункі са славацкімі пісьменнікамі, паказваюць атмасферу таго часу. М. Трус у кнізе выклаў абсягі тэмы праз нарысы-раздзелы «Пачатак знаёмства», «Браціслава вітае ганаровых гасцей», «Памятнае гасцяванне ў мястэчку Святы Юр», «Янка Купала і Людавіт Штур: рэха знаёмства са славацкай Модрай», «Угаварыць яго выступіць – гэта майстэрства: Янка Купала ў Пешцянах», «На вастрыі палітыкі і дыпламатыі: апошнія дні ў Славакіі. Забытае інтэрв'ю Янкі Купалы ў 1935 г.», «Славацкія сустрэчы Янкі Купалы: сям'я Шандараў», «Янка Купала і беларуская тэматыка на старонках часопіса "Браціслава – Масква"», «Некаторыя падрахункі паездкі Янкі Купалы па Славакіі (Чэхаславакіі) у 1935 г.».

Кніга М. Труса «Янка Купала ў Славакіі» яшчэ і напамін пра вартасці болей шырокай увагі да стасункаў нашых класікаў з шырокім светам. Хіба ж не маюць патрэбы ў грунтоўнай распрацоўцы тэмы «Максім Гарэцкі ў Вільні», «Янка Купала ў Казані», «Янка Купала ў Чэбаксарах», «Якуб Колас у Ташкенце», «Янка Маўр у Алматы», «Уладзімір Караткевіч у Кіеве», «Уладзімір Караткевіч ва Уладзівастоку», «Уладзімір Караткевіч у Маскве»?.. Тым болей, што падставы на тое ў выглядзе асобных артыкулаў, згадак у абсягах кніг, манаграфіях на іншыя тэмы ёсць. Метадалогію навуковага, творчага пошуку ў многім падказвае праца М. Труса.

Максім ЛАДЫМЕРАЎ

Таямніцы радавога маёнтка Агінскіх

Вядома, што Маладзечна з'яўлялася радавым маёнткам Агінскіх. Разам з тым захавалася адна таямніца гэтага знакамітага роду.

У 1738 годзе Казімір Ігнат Агінскі разам з жонкай Разаліяй Коцел перадае ва ўласнасць свайму брату Тадэвушу Францішку маёнтак Ганута і Маладзечна з фальваркамі. Князь Тадэвуш Францішак Агінскі (1712–1783) – вялікі пісар літоўскі, кашталян трокскі і віцебскі, стараста ашмянскі, ветборскі і пшэвальскі, граф на Маладзечне, Залессі, Ізабеліне, Аборку ў 1757 годзе пачынае ў Маладзечне будаўніцтва парафіяльнага касцёла і кляштара трынітарыяў. У гэты час ён жыве ў адрэстаўраваным палацы князёў Збаражскіх, размешчаным на Маладзечанскім замчышчы.

7 лістапада 1761 года памірае жонка князя Тадэвуша Агінскага, а 15 лютага яе пахавалі ў новым касцёле (Сяргей Верамейчык «М.К. Агінскі»). Узнікае адна цікавая дэталь: атрымліваецца, што княгіню праз тры месяцы перапахавалі, хаця рэлігійнымі канонамі гэта не віталася. Відавочна, разгадка крыецца ў наступным: магнаты і князі стваралі культавыя збудаванні яшчэ і як месца радавых пахаванняў.

Князь Мікалай Радзівіл (Сіротка), вандруючы па свеце, прывёз з Егіпта рэцэпт бальзаму, які выкарыстоўвалі для муміфікацыі целаў фараонаў. Тады і абрад пахавання ў скляпы (а не ў зямлю) становіцца культавым для найбагацейшай эліты ВКЛ. Так, у 1701 годзе пры фінансаванні кашталянам трокскім, скарбнікам ВКЛ Міхалам Казімірам Коцелам (яго род валодаў Беніцай, Маладзечна і навакольнымі землямі з 1634 года) у Беніцы пачынаецца будаўніцтва касцёла Найсвяцейшай Троіцы і кляштара бернардынцаў. Касцёл захаваўся па сённяшні дзень і з'яўляецца помнікам гісторыі і культуры. На ўваходзе знаходзіліся трохступеньчатыя надмагіллі (помнікі), а ў самім касцёле – сямейны склеп Коцелаў і Швыкоўскіх. Высечаныя з каменю грабніцы з каменнымі надмагільнымі плітамі знаходзіліся (і знаходзяцца цяпер) на глыбіні 2,5 – 3 метраў. Пэўная тэмпература і вільготнасць стваралі ўмовы для працяглага захоўвання целаў памерлых (нягледзячы на тое, што Троіцкі касцёл у Беніцы цяпер знаходзіцца пад аховай дзяржавы, у ім адбыліся акты вандалізму і марадзёрства.

Род князёў Агінскіх, значных дзяржаўных дзеячаў ВКЛ, пераважаў род Коцелаў. І, хутчэй за ўсё, касцёл Нараджэння Найсвяцейшай Панны Марыі (пазней ён будзе перайменаваны ў касцёл Св. Казіміра), які паставілі на ўласныя сродкі Тадэвуша Францішка Агінскага і яго жонкі Ізабелы з роду Радзівілаў, быў пабудаваны як будучы радавы склеп, тым больш, што Агінскія ў гэты час ужо жылі ў Маладзечанскім замку. Такім чынам, адна з загадак роду, што тычыцца месца пахавання бабулі Міхала Клеафаса Агінскага княгіні Ізабелы, становіцца блізкай да разгадкі.

Але ці стаў Маладзечанскі касцёл радавым склепам? Апанас Ярушэвіч у кнізе «Маладзечна і яго навучальныя ўстановы», выдадзенай у 1914 годзе ў Вільні, паказвае на тое, што *«...Маладзечна праз шлюбныя саюзы пераходзіла да розных уладальнікаў, і ў 1722 годзе яго атрымаў князь Іосіф Агінскі як пасаг за жонкай – княгіняй Ганнай Вішнявецкай... У Маладзечне быў пахаваны першы яго ўладальнік з роду Агінскіх...»*. У гэтай інфармацыі аўтар (а можа, і рэдакцыя) зрабіў памылку:

«...Маладзечна праз шлюбныя саюзы пераходзіла да розных уладальнікаў, і ў 1722 годзе яго атрымаў князь Іосіф Агінскі»

князь Іосіф Агінскі атрымаў у пасаг за жонкай маёнтак Моладаў ў Пінскім ваяводстве, а не Маладзечна ў Мінскім. Першым уладальнікам Маладзечна быў Казімір Іосіф (старэйшы брат Тадэвуша Казіміра), стараста маркаўскі і г.д., які памёр у 1769 годзе і (паводле А. Ярушэвіча) пахаваны ў Маладзечне. Казімір не быў значным дзяржаўным дзеячам, ад шлюбу з Разаліяй Коцел дзяцей не меў, але ён быў князем з магнацкага роду, і не дзіўна, а хутчэй лагічна, што і пахаваны быў там жа, дзе княгіня Разалія Агінскія, – у Маладзечанскім касцёле (у Беніцы пахаваныя толькі Коцел і Швыкоўскія).

Пра лёс княгіні Разаліі Агінскай гістарычных і архіўных звестак у нас пакуль няма, але адмаўляць тое, што яна магла быць пахаваная ў касцёле Нараджэння Найсвяцейшай Панны Марыі, нельга, хутчэй наадварот, паколькі менавіта за ёй у пасаг аддалі маёнтак Маладзечна, які яны з мужам перадалі князю Тадэвушу Францішку.

Касцёл Найсвяцейшай Панны Марыі ў Маладзечне згарэў. Аднавіць яго ў першапачатковым выглядзе так і не атрымалася, хаця рэканструкцыя ў стылі класіцызму захавала веліч касцёла

Цікава, што 7 кастрычніка 1768 года за свой кошт Агінскія (Ядвіга Тэрэза Залуская – другая жонка Тадэвуша Казіміра) прывезлі з Рыма спецыяльна для Маладзечанскага касцёла святыя рэліквіі. Памёр князь Тадэвуш Францішак Агінскі 25 лістапада 1783 г. у сваёй апошняй рэзідэнцыі – мястэчку Ганута, што за 15 кіламетраў ад Маладзечна, але пахаваны ў склепе капліцы Божага Цела касцёла Св. Яна ў Вільні, якую таксама пабудаваў на ўласныя сродкі ў апошнія гады жыцця.

Яго спадчыннікамі сталі браты Францішак Ксаверы і Андрэй Ігнат Агінскія. Малодшы з іх, Францішак Ксаверы, выбраў сваёй рэзідэнцыяй Залессе, але ў 1801 годзе пераехаў у Маладзечна, перадаўшы будучыя «Паўночныя Афіны» свайму пляменніку Міхалу Клеафасу. Да апошніх дзён Францішак Ксаверы жыў у Маладзечанскім замку. Тут жа 2 снежня 1812 года ён прымаў Напалеона, які адступаў; у гутарцы з ім з гонарам заўважыў: *«...Французы прыйшлі і адступаюць, а Міхал Клеафас паказаў сябе сапраўдным патрыётам, да канца змагаючыся за свабоду і незалежнасць сваёй радзімы!»*.

У 1814 годзе стары князь памёр. У сваёй кнізе А. Ярушэвіч паказвае, што князь Агінскі, як і яго дзядзька Казімір Іосіф, быў пахаваны ў Маладзечне. Але дзе знайшоў апошні прытулак князь, граф, канфедэрат, афіцэр ВКЛ? Ёсць усе падставы выказаць здагадку, што і Францішак Ксаверы быў таксама пахаваны ў касцёле, пабудаваным яго бацькам Тадэвушам Францішкам, дзе ўжо былі пахаваныя члены роду Агінскіх. Не выключана, што і жонка князя, Ядвіга Тэрэза з Залускіх (памерла да яго ў 1793 годзе), магла быць пахаваная ў радавым склепе Агінскіх.

Спадчыннікаў у Францішка Ксаверыя не было, і, паводле завяшчання, уладальнікам Маладзечна стаў князь Міхал Клеафас Агінскі, дзяржаўны дзеяч, кампазітар, рэвалюцыянер. Разам з маёнткам ён атрымаў у спадчыну і тытул графа на Маладзечне.

У 1822 годзе Агінскі з'язджае ў Фларэнцыю, дзе праз 10 гадоў, 15 кастрычніка 1833 года, памірае. Першапачаткова яго пахавалі на могілках пры храме Санта Марыя Навела, але неўзабаве, з патрабавання жонкі, перапахавалі ў пантэоне Санта Крочэ.

У 1823 годзе, пасля таго, як Міхал Клеафас Агінскі назаўсёды пакінуў радавы маёнтак, касцёл Найсвяцейшай Панны Марыі ў Маладзечне згарэў. Аднавіць яго ў першапачатковым выглядзе так і не атрымалася, хаця рэканструкцыя ў стылі класіцызму захавала веліч касцёла. У 1832 годзе кляштар пры ім закрылі, і ўсе пабудовы перайшлі павятоваму дваранскаму вучылішчу, за выключэннем трох памяшканняў, перададзеных пад плябанію касцёла. У 1864 годзе касцёл закрылі і пазней перабудавалі ў царкву.

У 1919 годзе будынак касцёла пры былым кляштары зноў вярнулі каталікам. Пры рэстаўрацыі яго асвяцілі ў імя Святога Казіміра. Побач з касцёлам, на скрыжаванні вуліцаў Замкавай і Афіцэрскай, пабудавалі прыдарожную капліцу. У час Вялікай Айчыннай вайны будынак моцна пацярпеў, пасля вайны яго разабралі, захаваўшы толькі бакавыя сцены фасада. Сёння там устаноўленае абсталяванне, працуюць людзі, якія наўрад ці ведаюць, што пад іх нагамі, пад каменна-бетоннай тоўшчай, магчыма, знаходзіцца магільны склеп князёў Агінскіх.

Гэта толькі версія, хаця і вельмі падобная да праўды. Канчатковы адказ і пацвярджэнне могуць даць архівы і спецыялісты-археолагі.

Мікалай ТАМАШЭЎСКІ,
намеснік старшыні Маладзечанскага Мясцовага дабрачыннага фонду «Спадчына М.К. Агінскага»
Фота Паўла САПОЦЬКІ

18 красавіка ў Нацыянальным гістарычным музеі адкрылася выстаўка «Скарбы шляхецкіх архіваў». Адметна, што на ёй былі прадстаўленыя экспанаты не з фондаў музея, а з прыватнай калекцыі Ігара Сурмачэўскага. Мастак і дызайнер, ён вядомы ў Беларусі і сваімі карцінамі, і калекцыяй унікальных гістарычных помнікаў XV–XIX стст.

Скарбы прыватнай калекцыі

Збор складаецца з сапраўды рарытэтных рэчаў – гэта адзначыла намеснік дырэктара музея Ніна Калымага, і яна ж заўважыла, што сёння ў музейных калекцыях амаль адсутнічаюць экспанаты XV–XVI стст. Магчымае выйсце з такой сітуацыі – праца з калекцыянерамі, і гэтаму апошнім часам надаецца вялікая ўвага. Тым больш, калі – а такое здараецца не вельмі часта – калекцыянеры самі згодныя падзяліцца з шырокай публікай тым, што збіралі доўгія гады. І. Сурмачэўскі – адзін з такіх людзей. Гэта пад час імпрэзы зазначыў Максім Рыжанкоў, памочнік прэзідэнта па пытаннях фізічнай культуры, спорту і развіцця турызму. Дарэчы, ён таксама калекцыянер, а з Сурмачэўскім яго зблізіла цікавасць да сфрагістыкі – вывучэння пячатак.

Сам І. Сурмачэўскі кажа, што цікавасцю да калекцыянавання ў пэўнай ступені абавязаны бацькам – гэта яны ў свой час прышчапілі хлопцу любоў да радзімы. А далей усё склалася як быццам само сабою. «Першую ікону я прыдбаў яшчэ пад час вучобы ў школе ў 1977 годзе. Яна была самай звычайнай, вельмі распаўсюджанай у Расіі – такія іконы вазамі прывозілі ў Маскву з Уладзіміра і прадавалі на кірмашах. Сама калекцыя пачала фармавацца, калі я вучыўся ў Беларускім тэатральна-мастацкім інстытуце. Менавіта тады я зразумеў, што такое наша беларуская гісторыя і беларускае мастацтва», – расказвае І. Сурмачэўскі. Калекцыянераў ён называе своеасаблівай закрытай кастай – яны не любяць расказаць, адкуль бяруць прадметы для сваіх калекцыяў, гэтаксама як і грыбнік ніколі не скажа, дзе ён збірае лепшыя грыбы. Многія рэчы для свайго збору І. Сурмачэўскі знаходзіць не толькі ў Беларусі, але і ў Літве, Польшчы ды іншых краінах.

Н. Калымага

Залатымі самародкамі нашай гісторыі (менавіта нашай гісторыі, а не сваёй калекцыі, што паказальна) назваў І. Сурмачэўскі прывілеі караля Жыгімонта III на будаўніцтва Свята-Духава сабора і Узнясенскага манастыра ў Мінску, які да нашага часу не захаваўся. Таксама І. Сурмачэўскі з'яўляецца ўладальнікам карты Г. Меркатара 1595 года і карты Т. Макоўскага 1631 года, твораў графікі і жывапісу ды іншых унікальных рэчаў. Дарэчы, значная частка калекцыі выстаўленая ў Нясвіжы. І, напэўна, гэта найлепшы лёс для любога збору – быць убачаным тысячамі людзей.

На заканчэнне імпрэзы выснову таму, што прагучала раней, падвёў журналіст Пётр Васілеўскі. Ён зазначыў, што ёсць людзі, якія рабілі б нешта, калі б для гэтага склаліся ўмовы або калі б час быў спрыяльны. А ёсць і тыя, хто проста робіць – на такіх людзях зямля трымаецца. І калі за калекцыянера кажа яго калекцыя – так сцвярджае П. Васілеўскі, – то збор І. Сурмачэўскага вельмі гаваркі.

Ніна КАЗЛЕНЯ
Фота аўтара

І. Сурмачэўскі (у цэнтры) ды П. Васілеўскі і М. Рыжанкоў

Развіццё краязнаўчага руху ў 1865—1917 гг.

Археаграфічныя даследаванні і выданні здзяйснялі Віленская і Віцебская археаграфічныя камісіі. Гэтыя афіцыйныя навуковыя ўстановы былі створаныя з мэтай «абгрунтаваць адзін з кірункаў вялікадзяржаўнай палітыкі – русіфікацыі Беларусі і Літвы. Найважнейшым абавязкам камісіі з'яўлялася публікацыя дакументаў пра існаванне праваслаўных цэркваў і манастыроў для доказу, што ВКЛ "спрадвечна руская земля"». Паражэнне паўстання 1863 – 1864 гг. не зменшыла грамадскую важнасць пытання гістарычных шляхоў беларусаў. Афіцыйныя колы імкнуліся, як і на папярэднім этапе, прыцягнуць да абгрунтавання курса русіфікацыі гістарычныя крыніцы, прысвечаныя беларускім рэгіёнам. Найбуйнейшым выданнем Віленскай археаграфічнай камісіі былі «Акты Віленскай камісіі...» у 39-і тамах. У «Актах...» апублікаваныя матэрыялы судоў, магістратаў, інвентары старостваў і маёнткаў, матэрыялы па царкоўнай уніі і інш. Выданне, заснаванае на дакументах Цэнтральнага архіва старажытных актавых кніг у Вільні, ахоплівала матэрыял, які адносіўся да населеных пунктаў уключаных ў межы Мінскай, Гродзенскай, Віленскай і Ковенскай губерняў.

Перыядычны друк на працягу ўсяго перыяду быў важным камунікацыйным каналам краязнаўства. Нават у цяжкія 1860–1870-я гг. у газетах і часопісах публікаваліся артыкулы, прысвечаныя апісанню матэрыяльнай і духоўнай культуры насельніцтва беларускіх губерняў і па іншых тэмах. З найбольшай рэгулярнасцю яны з'яўляліся ў выданнях, якія рэдагаваліся краязнаўцамі. Так, А. Кіркор рэдагаваў «Виленский вестник» і асобныя выпускі «Памятных книжек Виленской губернии», Р. Ігнацьеў – «Минские губернские ведомости», А. Семянтоўскі – «Памятные книжки Витебской губернии», Е. Раманаў – «Могилёвские губернские ведомости».

Губернскія ведамасці адлюстроўвалі штодзённыя рэгіянальныя падзеі, ствараючы своеасаблівы летапіс мясцовага жыцця, а таксама змяшчалі спецыяльна падрыхтаваныя краязнаўчыя матэрыялы. Апошнія найбольш канцэнтраваліся ў неафіцыйных частках гэтых газет. Праз газеты мясцовыя краязнаўцы звярталіся да сучаснікаў з заклікамі да вывучэння роднага краю. Так, інспектар дырэкцыі народных вучылішчаў Г. Кульжынскі на старонках «Гродненских губернских ведомостей» (1867, № 22) тлумачыў важнасць вывучэння родных мясцінаў, мінулага і асаблівасцяў сённяшняга побыту насельніцтва.

У пачатку XX ст. у губернскіх ведамасцях неафіцыйныя адзелы вылучыліся ў самастойныя органы друку, якія змяшчалі асабліва многа краязнаўчых матэрыялаў. Напрыклад, у «Витебских губернских ведомостях» з'явіліся артыкулы, прысвечаныя Віцебску, Полацку, Веліжу і іншым населеным пунктам. У газеце «Витебский вестник», якая пачала выдавацца замест прыпыненай неафіцыйнай часткі губернскіх ведамасцяў, публікаваліся даследаванні Е. Раманава, А. Сапунова (гісторыка-краязнаўчы нарыс «Французы ў Віцебску») і іншых краязнаўцаў.

Краязнаўчыя матэрыялы змяшчаліся ў «Минских Епархиальных ведомостях» і «Полоцких Епархиальных ведомостях», якія пачалі выдавацца ў гэты перыяд. У іх асвятляліся падзеі з гісторыі рэлігійнага жыцця ў розных мясцовасцях, а таксама і былі артыкулы этнаграфічнага характару.

Звесткі аб бягучых падзеях асвятляліся ў гарадскіх газетах, якія з'явіліся ў 1880-х гг. – пачатку XX ст. Гэта «Минский листок» (1886–1902), «Северо-Западный край» (1886–1905), «Северо-западная жизнь» (1911–1915) і інш. Каштоўныя публікацыі па этнаграфіі, гісторыі, археалогіі і іншых пытаннях былі надрукаваныя ў расійскіх часопісах «Этнографическое обозрение», «Вестник Юго-Западной и Западной России» (1862–1871).

Матэрыялы краязнаўчага характару публікаваліся ў выданнях грамадскіх арганізацыяў і ў прыватных часопісах на польскай мове (расійскіх і замежных): «Kwartalnik Litewski» «Kraj» (СПб), «Litwa i Ruś» (Вільня), «Kwartalnik Historyczny», «Lud» (Львоў, Аўстрыйская імперыя) і інш. Выходзілі яны не працягла, але змясцілі цікавыя артыкулы і рэдкія фатаграфіі. Для беларускіх краязнаўцаў адным з галоўных перыядычных органаў стаў часопіс Польскага краязнаўчага таварыства «Зямля» («Ziemia»), які пачаў выходзіць у Варшаве з 1909 г. Тут друкаваліся такія найбуйнейшыя краязнаўцы, як В. Шукевіч, Я. Булгак і інш. Я. Булгак, «бацька краязнаўчай фатаграфіі», змясціў цікавыя артыкулы і выдатныя фотаздымкі беларускіх гарадоў і іншых мясцовасцяў. Краязнаўцы імкнуліся да выпуску рэгіянальных органаў, але ў складаных умовах пачатку XX ст. гэта было зрабіць складана. Так, у 1917 г. выходзілі «Нашы крэсы. Магілёўшчына» («Nasze kresy. Mohylowszczyzna»; Магілёў–Масква).

У публікацыях расійскіх і замежных перыядычных выданняў, прысвечаных рэгіёнам Беларусі, гэтыя землі разглядаліся ці як заходнія часткі Расіі, ці як гістарычна польскія тэрыторыі. Вастрыня палітычнага, як называлі ў той час – «польскага» пытання, актыўная русіфікацыя, няспеласць нацыянальнай беларускай ідэі былі прычынамі такіх трактовак. Такім чынам, у краязнаўчых публікацыях, як у люстэрку, адбівалася ідэалагічная, светапоглядная пазіцыя іх аўтараў, складанасць працэсу згуртавання мясцовых інтэлектуальных элітаў вакол афіцыйных або апазіцыйных ідэйных плыняў. Напрыклад, русафільскі характар краязнаўчых публікацыяў у газеце «Витебский вестник» асабліва праяўлялася ў працах А. Пшчолкі.

На пачатку XX ст. значны ўплыў на разгортванне краязнаўчага руху аказала газета «Наша Ніва». У тым вялікім уплыве газеты на фармаванне нацыянальнага беларускага руху, на ход грамадскіх, літаратурных і культурных працэсаў у 1906–1915 гг. ёсць магутны ўнутраны рухавік – беларуская мова, прызнанне факта існавання самастойнага беларускага народа і шырокае, панарамнае адлюстраванне народнага жыцця. У інфармацыйных падборках «З Літвы і Беларусі», «З усіх старон», «Аб усём патроху» адлюстроўваліся бягучыя падзеі з розных мясцінаў, у т.л. з культурнага жыцця, уключаючы краязнаўчыя мерапрыемствы. Газета наладжвала цесныя сувязі з мясцовай інтэлігенцыяй, абуджала народныя таленты. Так, за першыя 3 гады выдання было надрукавана больш за 900 карэспандэнцый амаль з паўтысячы вёсак, мястэчак і гарадоў. З ліку яе аўтараў і супрацоўнікаў выйшлі такія выдатныя краязнаўцы, як браты І. і А. Луцкевічы, У. Галубок.

Улады з мэтай узмацнення культурнага ўплыву ў Паўночна-Заходнім краі адкрылі ў 1867 г. Віленскую публічную бібліятэку, у якую паступіла частка рукапісаў і кніг з канфіскаваных кляштарных і іншых бібліятэк, сярод іх былі важныя дакументы, прысвечаныя беларускім мясцінам. Пры бібліятэцы быў музей, створаны з экспанатаў Віленскага музея старажытнасцяў Тышкевічаў.

У асобных бібліятэках назапашваліся спецыялізаваныя зборы, якія мелі вялікую каштоўнасць для вывучэння беларускіх рэгіёнаў. Краязнаўчы характар мела бібліятэка Віцебскай вучонай архіўнай камісіі. Савет камісіі звярнуўся да мясцовай грамадскасці з заклікам перадаць у бібліятэку творы краязнаўчай літаратуры. Шматлікія арганізацыі – статыстычныя камітэты, архівы, музеі, універсітэты і інстытуты адгукнуліся на просьбу віцяблянаў. Свае кнігі перадалі краязнаўцы А. Сапуноў, В. Арсеньеў, В. Стукаліч, В. Кадыгробаў, Н. Багародскі і іншыя, паступілі краязнаўчыя кніжныя зборы М. Нікіфароўскага і А. Семянтоўскага. У 1911 г. у бібліятэцы налічвалася 1 859 назваў выданняў у 3 726 экзэмплярах, з іх 600 кніг былі прысвечаныя Віцебшчыне. У іншых выданнях па гісторыі, генеалогіі, геральдыцы, зборніках гістарычных дакументаў таксама змяшчаліся матэрыялы пра Віцебскі край.

Валянціна САІТАВА

Працяг тэмы. Пачатак у №№ 21–23, 34–36, 42–44 за 2012 год, №№ 2–8, 12–15 за 2013 год

(Працяг будзе)

Традыцыі і сучаснасць

Пост-метал «Re1ikt» і ягоныя вытокі

DVD «Re1ikt» – «Kryhachod», Мн., 2012, «Vigma»

DVD «Kryhachod» мінскага (з каранямі ў Светлагорску/Шацілках) гурта «Re1ikt», натуральна, не першае музычнае відэа, прааналізаванае нашай газетай, але шчырыя заўзятары здолеюць адшукаць у ім нямала неверагодных, нечуваных раней звабаў. Папершае, у калекцыянераў відэазапісаў жывых канцэртаў розных традыцыйных фірмачоў упершыню з'явіцца жаданне дадаць нешта сваё, створанае паводле лепшых сусветных стандартаў: тут і жывы эмацыйны кантакт з публікай, і здымкі некалькіх камераў, і віртуозны мантаж, і выдатны стэрэагук. Па-другое, прадстаўлены на дыску гурт іграе не рэха колісь папулярных стыляў рок-музыкі, а найбольш актуальную плынь пост-метал-рока, што дало яму шанец паездзіць з канцэртамі не толькі па ўсёй Беларусі, але й па многіх краінах Еўропы: Польшча, Германія, Італія, Літва, Украіна… «Re1ikt» сёння – гэта гучыць з гонарам.

Аб'ектам увагі відэакружэлкі стаў канцэрт-прэзентацыя іхняга альбома «Рэкі прабілі лёд», які апынуўся настолькі прывабным, што праз год рынак запатрабаваў дадрукоўкі накладу. І гаворка ж не пра самапальную нарэзку камп'ютарных дыскаў, а пра паўнавартасны прамысловы тыраж альбома, які так шануюць сапраўдныя меламаны-калекцыянеры. Дый сам DVD – прамысловы выраб з маштабнай праграмай на паўтары гадзіны, зручным флэш-дызайнам і стылёвай мастацкай аздобай. Аздоба, зрэшты, «закошаная» пад так званую DIY-culture, якой уласцівы мінімалізм, бо хто ж спадзяваўся, што фантазіі маладога калектыву амаль адразу перакупіць салідная фірма «Vigma», якая супольна з «БМАgroup» выдавала й сам альбом.

Тутака ж заўважым адразу (каб далей не блытацца з заўвагамі): хлопцы ўсё ж далі прамашку, а выдаўцы проста не дагледзелі, калі акрамя блытанай польска-англійскай лацінкі забыліся напісаць на вокладцы, што акрамя поўнага канцэрта «Re1ikt» у прэстыжным сталічным клубе (на live-відэа – увесь альбом, 7песень, агульным часам 1'2"09) дыск утрымлівае яшчэ й тры кліпы — «Рэкі пад ільдом» (0'10"52), «Тры хвіліны» (0'04"21), «Last Surgery» (рускамоўная версія 0'04"09). Дый прозвішчы рэжысёраў тых відэаролікаў не

зашкодзіла б напісаць для пільных калекцыянераў. Але ў астатнім DVD – грунтоўны фірмовы прадукт.

Наўрад ці каго збянтэжыць, што дзве альбомныя песні трапілі на відэа ў дзвюх версіях – канцэртнай і кліпавай, бо асобная асалода глядзець кожную з іх. Дый дварова-індустрыяльны відэабонус з ранніх запісаў, калі гурт «Re1ikt» шукаў сябе ў англарускамоўных практыкаваннях, каб вярнуцца (паводле Юнга) у лона роднай культуры, зможа балазе больш выразна акрэсліць перыпетыі творчага шляху, складнікі стылістычных і філасофскіх адкрыццяў на ім.

Зручна, што ўсе песні канцэртнай часткі відэа падзеленыя на асобныя трэкі, каб глядач мог лёгка адшукаць і паўтарыць найбольш упадабаныя фрагменты. Дый тэлеканалы заўтрашняй Беларусі змогуць аператыўна скарыстоўваць поўны канцэрт або ягоныя трэкі ў тэматычных гутарках музычных тэлеперадачаў.

Асабіста мяне найбольш уражвае першае знаёмства з дасканала пададзеным музычным вытворам сучаснага шоўбізу: заладоўваеш дыгітал-відэадыск у плэер і на экран тэлевізара выплывае меню вольнага выбару – «Play all», «Select songs», «Clips», «Credits». Пра апошні параметр можаце адразу забыць, бо ён і так выплывае напрыканцы канцэрта – гэта выходныя звесткі фільма-канцэрта: дадзенае відэа было запісанае 30 кастрычніка 2010 года ў клубе «Re:Public» (Мінск). Зрэшты, адмыслоўцам акурат будзе цікава адразу, хто і што там рабіў, бо няма таго нават на вокладцы, але давядзецца ўсё ж перакладаць з англійскай: Аляксандр Дземідзенка (бубны), Ягор Любічаў (гітара), Віталь Макшун (гітара), Зміцер Наркевіч (бас-гітара), Уладзімір Казлоў (вакал). Аператары – Аляксандр Мядзведскі (ён жа й мантажом займаўся), Віталь Наркевіч, Зміцер Новікаў. Прафесійнае мастацкае рэдагаванне ўсяго DVD– таго ж А. Мядзведскага з Пецярбурга ды нашага А. Дземідзенкі. Цітры (ды інтэрнэт-рэквізіты гурта) ідуць, натуральна, на тле музыкі «Re1ikt» (кампазіцыя «Прыкметы»), хоць у альбоме і канцэрце яна 9 хвілінаў, а тут спатрэбілася меней. Праўда, цітры датычаць толькі канцэрта, а не кліпаў, хоць дастаткова было адным радком напісаць: рэжысёры і аператары кліпаў (раз, два, тры) канулі ў Лету…

А кліпы хоць і сціплабюджэтныя, але знатныя – сімвалічныя, сюжэтныя, месцамі сягаюць да эксперыментальнага мантажу, экзатычных планаў. Найбольш гэта датычыць «Рэкі пад ільдом», бо ў «Трох хвілінах» цаглінамі відэаканструкцыі стала нарэзка і мантаж канцэртна-сюжэтных кадраў, што, магчыма, найбольш адпавядае іхняй меланхалічнай, але ёмістай музыцы. Ёсць што паслухаць і на што паглядзець.

Калі ў рэжыме «Меню» націскаеш функцыю «Выбар песні», лёгка знаходзіш тыя ж «Прыкметы» (ці што яшчэ з 7-і трэкаў альбома) і пераконваешся, што пачынаюцца яны з 21-й хвіліны канцэрта, каб завершыцца 30-й. Склейкі ў рэжыме поўнага прагляду практычна не заўважаеш (галівудскі мантаж!).Тэксты можна цытаваць наўпрост у рэжыме прайгравання (галівудскі запіс):

Ой, рана на Йвана,
Ой, рана на Йвана,
Проці Йвана ночка мала,
Ой, рана на Йвана.
Дзе Купала начавала,
Ой, рана на Йвана?
Начавала ў чыстым полі,
Ой, рана на Йвана…

Зрэшты, працытаваны тут фальклор – толькі фрагмент цалкам аўтарскага альбома, хоць практыка жывых кантактаў з сакральнай народнай творчасцю ў музыкаў гурта й без таго не бедная (прыгадаем хоць бы больш ранні сінгл «Вытокі» (2010), дзе яны старажытнымі мелодыямі падкрэслілі, адкуль выплывае іхні неверагодны пост-метал). Пасля шматлікіх прэзентацыяў сваіх рэлізаў 2012 года ў сталічных клубах, па рэгіёнах і ў замежжы яны справакавалі музычную прэсу на вестку пад загалоўкам «"Re1ikt" едзе ў тур "па бабулек"». Ясна дзеля чаго: хлопцы будуць умацоўваць нітку жыцця свайго авангарднага progressive-post-metal, хоць ён і цяпер пераканаўчы й не банальны:

Тры хвіліны перакур,
гадзіннік стане…
Тры хвіліны перакур,
я прыхаплю з сабою трохі туману.
Туман, бы ў Англіі,
застыне над вуліцамі былых гарадоў,
Прывіды хутка іх пакінуць,
прытулак ціхі апошніх сноў.

Гэта з фінальнай песні альбома «Рэкі прабілі лёд» і канцэрта «Крыгаход». Яна – самая кароткая – і называецца «Тры хвіліны». Надзвычай сімвалічная, каб даць слухачу аптымістычны пасыл напрыканцы: «І няхай з ранку не ўзгадаю, чаму мне так баліць у душы. / Ты сказаў, а я прымаю,.. можа і заеду калі?».

І заедзе ж. Бо не назаўсёды ж мы «скаваны, бы рэкі пад ільдом», і хоць пакуль цяжка, але ведаем, што «лёгкія дарогі не трымаюць след». А жыць – гэта значыць пакідаць сляды, таму абралі цяжкую дарогу.

Вітаўт **МАРТЫНЕНКА,**
музычны крытык

Продак прыкмячаў

У травень будзе мужык управен.
У май каню сена дай, а сам на печ уцякай.
Май – жывёлу ў поле пхай.
Май зямлю грэе, а сіверам вее.
Май халодны – не будзеш галодны.
Як у маі суха, то падцягвай бруха.
Майская трава галоднага корміць.
Грымоты ў маі спрыяюць ураджаю.
Май – і пад кустом рай.
Май халодны, год хлебаробны.
Прыйшоў Алісей *(7 мая)* – авёс пасей.
Сей лён на Станіслава *(8 мая)*, вырасце як лава.
На Якуба *(13 мая)* грэе люба.
Да Міколы *(22 мая)* не сей грэчкі, ды не стрыжы авечкі.
Мокра на Макея *(24 мая)* – і лета не прасушыць, а сухі Макей прыйшоў – і лета не намочыць.
Прыйшлі Сідары *(27 мая)*, прыйшлі і сіверы.
Свята Пахом *(28 мая)* павее цяплом.
Магдалена *(29 мая)* – вады па калена.
Калі ў маі здарыцца хаця б адзін мароз, раёў пчаліных не будзе.
Калі вольха раней распусціцца за бярозу, год будзе мокры, як наадварот – сухі.
Як дуб ліст разгорне – чакай халадоў.
Позні росквіт рабіны – да доўгай восені.

Вада прыйшла

Паводкі як правіла ўзнікаюць з-за сезоннага раставання снегу і непрадказальна вялікіх ападкаў. Падобнае можа здарыцца ў даволі кароткі прамежак часу, і на рэакцыю застаецца ўсяго некалькі секундаў.

У такой сітуацыі неабходна:

– пастарацца сабраць усё, што можа спатрэбіцца: выратавальныя кругі, лесвіцы, вяроўкі, сігнальныя сродкі;

– ратаваць людзей, якія адрэзаныя вадой ад астатніх, аказаць першую дапамогу;

– калі ёсць небяспека апынуцца ў вадзе, то да прыезду выратавальнікаў неабходна зняць абутак і пазбавіцца ад цяжкай і цеснай вопраткі;

– напоўніць кашулю ці штаны лёгкімі плавучымі прадметамі (мячыкі, пустыя закрытыя пластыкавыя бутэлькі і інш.);

– выкарыстоўваць сталы, аўтамабільныя шыны, запасныя колы, выратавальныя пасы, каб утрымацца на паверхні;

– перад тым, як скочыць у ваду, набярыце ў лёгкія як мага больш паветра, схапіцеся за першы прадмет, што патрапіць пад руку, і плывіце па цячэнні, захоўвайце спакой;

– скакануць у ваду толькі ў апошні момант, калі няма надзеі на хуткае выратаванне.

Першае, што неабходна зрабіць пасля таго, як пачулі папярэджанне пра стыхійнае бедства, – выключыць электрычнасць і газ. Збярыце ўсе неабходныя рэчы на дах ці гарышча, раздайце ўсім членам сям'і іх дакументы ў пакунках, што не прамакаюць. Рэкамендуецца падрыхтаваць усе плавучыя матэрыялы, якія могуць спатрэбіцца для пабудовы плыта.

Калі вы трапілі ў халодную ваду, пастарайцеся выбрацца з яе ў бліжэйшыя 3 хвіліны: праз 5 хвілінаў могуць пачацца сутаргі. Калі вырашыце выбрацца з вады самастойна (і калі побач няма ніякіх дапаможных прадметаў, якія можна было б выкарыстоўваць як плыт ці трымацца за іх), памятайце – плывіце да мэты наўскасяк.

Вольга **ЦЫНКЕВІЧ,**
інспектар **ЦРАНС**
г. Мінска

Май

1 – Кроль Абрам Іосіфавіч (1913, м. Койданава – 1990), жывапісец – 100 гадоў з дня нараджэння.

1 – Алесь Крыга (сапр. Асіпенка Аляксандр Аляксандравіч; Мінск, 1943 – 2009), празаік – 70 гадоў з дня нараджэння.

3 – Папоў Георгій Лявонцьевіч (1918–1995), празаік, заслужаны работнік культуры Беларусі – 95 гадоў з дня нараджэння.

3 – Сіўко Франц Іванавіч (1953, Мёрскі р-н), празаік, публіцыст – 60 гадоў з дня нараджэння.

4 – Кашкурэвіч Тодар Арленавіч (1963, Мінск), жывапісец, графік, даследчык старажытнай беларускай музычнай традыцыі – 50 гадоў з дня нараджэння.

6 – Бяссмертны Аркадзь Львовіч (1893, г.п. Сураж – 1955), скрыпач, дырыжор, педагог, заслужаны артыст Беларусі – 120 гадоў з дня нараджэння.

6 – Юрась (Юрый Мікалаевіч) **Свірка** (1933, Докшыцкі р-н – 2004), паэт, перакладчык, лаўрэат Літаратурнай прэміі імя А. Куляшова (1993) – 80 гадоў з дня нараджэння.

7 – Панятоўскі Юзаф Антон (1763–1813), ваенны і дзяржаўны дзеяч Рэчы Паспалітай, генерал-лейтэнант, удзельнік паўстання 1794 г. – 250 гадоў з дня нараджэння.

7 – Скірмунт Раман Аляксандравіч (1868, Пінскі р-н – 1939), палітычны і грамадскі дзеяч – 145 гадоў з дня нараджэння.

8 – Некрашэвіч Сцяпан Міхайлавіч (1883, Светлагорскі р-н – 1937), мовазнаўца, акадэмік НАН Беларусі – 130 гадоў з дня нараджэння.

8 – Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь (1953) – 60 гадоў з часу стварэння.

9 – Івашын Васіль Уладзіміравіч (1913, Дзяржынскі р-н – 2009), літаратуразнаўца, педагог, акадэмік НАН Беларусі, член Расійскай акадэміі адукацыі – 100 гадоў з дня нараджэння.

10 – Янка Маўр (сапр. Фёдараў Іван Міхайлавіч; 1883 – 1971), пісьменнік, адзін з пачынальнікаў беларускай дзіцячай літаратуры, заслужаны дзеяч культуры Беларусі, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі (1972) – 130 гадоў з дня нараджэння.

10 – Канановіч Іван Іванавіч (1938, Капыльскі р-н), пісьменнік – 75 гадоў з дня нараджэння.

Сябры!
Наступны нумар «Краязнаўчай газеты» выйдзе 13 мая.
Будзем разам і надалей!

Творчасць нашых чытачоў

Чому так швидко все позаростало,
І не пізнати річки і ставка,
Де я дитям у тій воді купалась,
Де випадала ранками роса.

Моя Попівка – джерело дитинства,
І радість, що любов мені дала,
Де мої друзі, більша половина,
Як пташки, розлетілися з гнізда.

У нас другі печалі і турботи,
Але як бачу рідне те село,
Де так давно осиротіли хати,
Туди ніхто не стукає в вікно.

Ніхто там не співає, не гомонить,
Пташки літають тільки в бур'яні,
А вікна помарніли наче очі,
І сонце вже не дивиться туди.

Пробач, село, що я тебе покинув,
У світ пішов, хоч думав – повернусь,
Я знав завжди тривог своїх причину,
Та тільки вже нічого не вернуть.

А по весні у березі співають
До ранку невгамовні солов'ї.
Вони мене в дитинство повертають,
Радію з ними я своїй землі.

Що ще не вмерла наша Україна,
Повернуться нащадки козаків,
І буде спілкуватися родина,
Щоб захистить її від ворогів.

* * *

Рідна мова, наче добра пісня
Поруч з нами по житті іде,
І завжди хвилює наше серце,
Бо в душі у кожного живе.

Вибачайте ви мені за сміливість,
Що в коханні їй я признаюсь,
Бо мені так говорить хотілось,
Що її найкращою лічу.

Говорити про своє кохання,
Про свою турботу і любов,
Може нам матусенька до рання,
І забути про спокій і сон.

А в піснях, що мама нам співає,
Чуємо ми радість і печаль,
І навіки в серці залишає,
Мову, що допомагає нам.

Людміла БАНДАРЭНКА, г. Мінск

Жарт тыдня ад Каласка і Калінкі

Сын склаў спіс гасцей, якіх хоча запрасіць на сваё вяселле. Паказвае бацьку, той дае параду:

– Гэтага пакінь... Гэтага зачаркні... А гэтага – ваабшчэ вычаркні...

Малая краязнаўчая энцыклапедыя

(Пачатак у № 1 за 2003 год)

МІНСКІ ЦАРКОЎНЫ ГІСТОРЫКА-АРХЕАЛАГІЧНЫ КАМІТЭТ – існаваў з лютага 1908 г. да пачатку Першай сусветнай вайны. Займаўся зборам і вывучэннем старажытнасцяў на тэрыторыі Мінскай губерні. Даследаваў гістарычныя помнікі і манастырскія архівы, збіраў і зберагаў старадаўнія рэчы. Выдаў зборнік «Минская старина» (1909–1911), даведнік «Рукапісны аддзел старадрукаваных кніг бібліятэкі Мінскага царкоўнага гісторыка-археалагічнага камітэта. 1909» (вып. 1). Пры камітэце існаваў Мінскі царкоўна-археалагічны музей.

«МІНСКИЕ ГУБЕРНСКИЕ ВЕДОМОСТИ» – афіцыйная газета. Выдавалася ў 1838–1917 гг. на рускай мове Мінскім губернскім праўленнем. Мела афіцыйную (урадавыя ўказы, паведамленні, аб'явы і распараджэнні губернскіх уладаў) і неафіцыйную часткі з дадаткамі да іх. У неафіцыйнай частцы (выходзіла ў 1838–1892 і 1911 гг.) змяшчаліся гістарычныя, гісторыка-краязнаўчыя, фальклорныя, этнаграфічныя, статыстычныя і інш. матэрыялы.

Першыя этнаграфічныя публікацыі змешчаныя ў 1861–1862 гг. Частка з іх была выкліканая абвастрэннем сацыяльна-палітычных і нацыянальных супярэчнасцяў у краі і насіла тэндэнцыйны характар. Надрукаваныя артыкулы «Вясельны абрад у вёсках Навагрудскага павета» М. Дзмітрыева (1861, № 15–16), «Аб забабонах нашага простага люду ў славянскіх прыходах» (1861, № 11–12, аўтар невядомы). У 1865–1869 гг. колькасць публікацыяў значна павялічылася. Некаторыя з іх захоўвалі тэндэнцыйны характар («Погляд рускага на звычай ставіць прыдарожныя крыжы ў Заходняй Расіі» У. Руміна, 1868, № 31). Тэматычна артыкулы былі арыентаваныя на апісанне традыцыйнай абраднасці («Вясельныя звычаі і абрады простага люду ў Барысаўскім павеце» Шумовіча, 1865, № 22–29, 35–37, 39, 41–43; «Апісанне пахаванняў і дзядоў у Навагрудскім павеце Мінскай губерні» Дзмітрыева, 1867, № 9; «Абрады пры пахаванні ў Ігуменскім павеце, вёсцы Пырашыве» П. Васюковіча, 1867, № 12; «Нарысы народных святкаванняў і маленняў на Палессі» У. Сакалова, 1869, № 25; «Вясельныя абрады сялянаў Мінскага павета» М. Рубяроўскага, 1869, № 31; «Куст, абраднае свята ў пінскіх сялянаў», 1866, № 31 і «Прасвяты камень» (пра пакланенне гэтаму каменю, 1868, № 50, аўтары публікацыяў невядомыя), песеннага фальклору («Пра духоўныя простанародныя песні Паўночна-Заходняга краю» Р. Кулжынскага, 1868, № 35; «Беларускія песні, сабраныя ў Барысаўскім павеце» Д. Булгакоўскага, 1868, № 23), народнай этыкі («Нарысы нораваў Барысаўскага павета» Сакалова, 1869, № 2; «Аб маральным побыце сялянаў Мазырскага павета» С-цова К., 1869, № 34). Шэраг артыкулаў насіў нарысавы характар («З жыцця ў Пінскім павеце», «Ліст з Палесся», «Палессе. Паездка на возера Князь-жыд», «Нататкі пра гор. Барысаў і яго павет», «Сёе-тое пра народнае жыццё»). Шмат звестак пра духоўную і матэрыяльную культуру палешукоў у артыкуле «Нарысы Беларускага Палесся» (1868, № 21, 33, 36, 39, 47; 1869, № 10, 12–14).

Найбольш прадукцыйны перыяд публікацыі этнаграфічных матэрыялаў – 1876–1879 гг., калі для супрацоўніцтва ў газеце былі прыцягнутыя сілы мясцовай інтэлігенцыі. Надрукаваныя артыкулы А. Васільевай «Вясельныя абрады ў раёне Грабаўскай воласці Мазырскага павета», «Кароткі нарыс вёскі Грабава Мазырскага павета», «Сялянскія памінкі ў Мазырскім павеце», «"Князь", ці "Жыд" возера (Легенды)», «Калядныя святы ў сялянаў Мазырскага павета», «Нататка пра абшчыннае земляробства ў сялянаў Мінскай губерні», «Веснавыя песні і абрады ў вёсках Мазырскага павета», «Легенды і павер'і ў Мінскай губерні», «Нататка пра побыт сялянаў Мазырскага павета», «Вёска Бяседкі Мазырскага павета», «Брацкая свечка (этнаграфічны нарыс)», «Вясельныя абрады ў Мароцкім прыходзе Мазырскага павета». Цікавыя звесткі пра жыллё, адзенне, ежу, сямейны побыт, абрады і вераванні ў артыкуле «Тураў і Тураўшына» Б. Тура (1877, № 4–9). Пра пранікненне ў этнаграфію матэрыялістычных і атэістычных поглядаў сведчыць праца М. Ласіеўскага «Сонца і месяц у народных легендах і замовах Паўночна-Заходняга краю», у якой на канкрэтным міфалагічным і фальклорным матэрыяле аналізуецца аснова калядных і купальскіх святкаванняў. У 1889–1892 гг. колькасць этнаграфічных матэрыялаў была адносна невялікай. Побач са змястоўнымі працамі А. Слупскага «Кароткі нарыс грамадскага побыту Беларусі наогул і Мінска ў прыватнасці» і М. Доўнар-Запольскага «Археалагічнае дасследаванне Мінскай губерні» (аб значэнні археалагічных працаў для этнаграфіі) публікаваліся матэрыялы рэакцыйнага зместу, якія прыніжалі чалавечую годнасць карэннага насельніцтва, напрыклад, «Аб інтэлектуальным развіцці палешукоў (жыхароў Палесся)».

Этнаграфічную каштоўнасць маюць артыкулы «Пра музычныя схільнасці смальнянаў», «Погляд нашых сялянаў на хваробы наогул і на трасцу ў прыватнасці», «Народныя песні», «Народныя песні, запісаныя ў в. Бухлічы Пінскага павета і в. Рубель Мазырскага павета. Запісаў А.Ф.С.», «Народныя песні (запісаныя ў Пінскім павеце)».

Супрацоўнікі рэдакцыі ўдзельнічалі ў арганізацыі Маскоўскай антрапалагічнай выстаўкі ў 1879 г., на якую даслалі рукапіс 100 песень і некалькіх артыкулаў.

Газета зарэгістравана ў Міністэрстве інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Рэгістрацыйнае пасведчанне № 384 ад 15 мая 2009 г.
Заснавальнікі: грамадскае аб'яднанне «Беларускі фонд культуры», вытворчае прыватнае ўнітарнае прадпрыемства «Светач», Гілеп Уладзімір Аляксандравіч.

Краязнаўчая газета

Індэкс індывідуальнай падпіскі – 63320
ведамаснай – 633202

Галоўны рэдактар – Уладзімір ГІЛЕП.
Намеснік галоўнага рэдактара Уладзімір Пучынскі.
Рэдкалегія: Анатоль Бутэвіч, Андрэй Вірчак, Анатоль Грыцкевіч, Алесь Карлюкевіч, Лідзія Кулажанка, Адам Мальдзіс, Вячаслаў Рагойша, Віктар Хурсік.

Наш адрас: 220029, г. Мінск, вул. Траецкая набярэжная, 6.
Тэл. 283 28 26, 334 61 62.
Тэл./факс 334-42-03
E-mail: kraga@tut.by

З-за абмежаванасці сродкаў выданне безганарарнае.
Аўтарскія рукапісы не рэцэнзуюцца і не вяртаюцца.
Аўтары допісаў у рэдакцыю паведамляюць сваё прозвішча, імя і імя па бацьку, асноўнае месца працы, зваротны адрас.
Меркаванні аўтараў могуць не адпавядаць пункту гледжання рэдакцыі.
Аўтары нясуць адказнасць за дакладнасць матэрыялаў.
Пры перадруку спасылка на «Краязнаўчую газету» абавязковая.

Падпісана да друку: 25.04.2013
Газета надрукавана ў друкарні ТДА «Знамение» (Мінск, вул. Каржанеўскага, 14).
Ліцэнзія ЛП № 02330/0150475 ад 25.02.2009.

Заказ 352.
Тыраж 1040 асобнікаў.